**М. А. Гадлеўская, С. А. Сігаева**

# ВОБРАЗЫ МІФАЎ СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ Ў ВЕРШАХ-ВЕРСЭТАХ У. АРЛОВА

Міфы трывала ўвайшлі ў культуры ўсіх народаў свету, адбіўшыся ў іх фальклоры – у першую чаргу ў казках і легендах. З фальклору міфы натуральным чынам патрапілі ў мастацкую літаратуру. На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва міфалогія захоўвае сваю актуальнасць як структура свядомасці, не было эпохі, якая не ведала б міфа. Нават калі меў месца працэс дэміфалагізацыі, паралельна яму заўсёды ішоў працэс зваротны, нараджаўся новы міф. Чалавек мае патрэбу ў міфе, без яго ён адчувае сябе няўтульна ў рэальным свеце. Паводле Т. Шамякінай, міфалогія – форма свядомасці, асаблівы працэс мыслення, які захаваўся з самых архаічных часоў [Шамякіна]. Вобразы-архетыпы, якія фігуруюць у міфалагічных сюжэтах, добра знаёмыя і зразумелыя для прадстаўнікоў усіх культур. Архетып – універсальны сімвалічны матыў, які існуе ў чалавечай падсвядомасці і выяўляецца адначасова ў культуры многіх народаў. Архетып – мадэль, паводле якой фарміруецца пэўны твор, адлюстроўваючы агульначалавечыя каштоўнасці, адлюстраваныя ў сімвалах, выяўленыя ў міфах. Гэта вобразы, сюжэты і матывы, якія часта паўтараюцца ў фальклорных і літаратурных творах.

Пісьменнік У. Арлоў, які атрымаў вышэйшую адукацыю як гісторык, дакладна добра разумее ролю міфа ў жыцці людзей на працягу стагоддзяў. У сваёй творцасці ён нярэдка выкарыстоўваў вобразы-архетыпы.

Зборнік вершаў у прозе У. Арлова “Там, за дзвярыма” (1991) – гэта творы, аб’яднаныя спрадвечным матывам пошуку гармоніі паміж чалавекам і светам. Варта звярнуць увагу на тое, што гэтыя вершы з’яўляюцца версэтамі. Версэт – гэта напісаны прозай невялікі лірычны твор, які сваёй вобразнасцю, павышанай эмацыянальнасцю і своеасаблівай рытмічнасцю набліжаецца да паэзіі. [Рагойша]. Па сваёй сутнасці, па форме выяўлення зместу твор з’яўляецца празаічным, але змест сведчыць пра паэтычнае паходжанне. Кампазіцыйна такія творы маюць невялікі аб’ём і падзялюцца на дробныя абзацы, што нагадваюць страфы ў звычайным рыфмаваным вершы.

У склад зборніка “Там, за дзвярыма” ўваходзяць тры вершы на старажытнагрэчаскую тэматыку: “Сізіф”, “Арфей” і “Мінатаўр”. Спасылаючыся на “Легенды і міфы старажытнай Грэцыі” М. А. Куна, Сізіф, сын Эола, за свае злачнствы ў дачыненні да багоў быў асуджаны вечна падымаць на высокую, стромкую гару велічэзны камень, а калі вяршыня будзе ўжо блізка, камень будзе зрывацца ўніз і дзеянне будзе пачыннаца зноў і зноў. У вершы добра прасочваеццца сюжэт міфа, захоўваецца паслядоўнасць падзей. Пасыл аўтара верша – атрыманне задавальнення ад самога працэса, бо вынік папросту адсутнічае. Бясконцасць гэтага працэсу У. Арлоў перадае праз некаторыя сінтаксічныя канструкцыі. Адна з іх гэта паралелізм – сінтаксічна-кампазіцыйны прыём паралельнага размяшчэння аднатыпных элементаў паэтычнага

выказванняў, што супастаўляюцца паміж сабой. [Рагойша]. У гэтым выпадку можна гаварыць пра сінтаксічны паралелізм – у творы можна заўважыць аднолькавую сінтаксічную будову суседніх вершаваных радкоў:

Вас, хто шкадуе мяне, кали я штурхаю ўгору свой камень, ператвараючыся ў бяздумны клубок знясіленых цягліц;

вас, хто – шчыра ці не – шкадуе мяне,калі мой вялізны камень зрываецца са стромы і са здзеклівым грукатам коціцца долу;

вас, хто шкадуе мяне, калі іду да ўзножжа, каб зноў пачаць свій пакутлівы шлях:

У творы таксама прысутнічае інверсія: "…з царства журботнага ценяў…", "…твар умакрэлы аддаўшы ласкаваму ветру…", "…з цяперашняй доляй маёй…" , якая трымае чытача ў напружанні.

Таксама трэба звярнуць увагу на такі прыём, як "рытарычныя фігуры" – стылістычны прыём у празаічнай і вершаванай мове, які ўзмацняе эмацыянальны напал выказвання. [Рагойша] У дадзеным выпадку, аўтар актыўна выкарыўстоўвае рытарычнае пытанне, якое не прадугледжвае адказ, а наадварот нясе ў сабе сцвярджэнне:

"ці адкрывалі вы простым смертным таямніцы падступных багоў? ці, можа, і вам удалося закуць у ланцугі бога смерці таната?

а мо вы таксама вярнуліся з царства журботнага ценяў, падмануўшы самога Аіда, як я, і жылі яшчэ доўга на беразе цёплага мора?"

На кожнае з гэтых пытанняў адказ будзе безумоўна адмоўны.

Пісьменнікі, у тым ліку і У. Арлоў, выкарыстоўваюць антычныя матывы і сімвалы, каб стварыць новыя і арыгінальныя творы, якія адлюстроўваюць сучасныя праблемы і ідэі. Такім чынам, інтэрпрэтацыя антычнага сюжэту ў літаратуры мае вялікае значэнне, паколькі яна дазваляе аўтарам звяртацца да ўніверсальных тэмаў, усталёўваць сувязь з класічнай літаратурай і даследаваць сваю ўласную гісторыю і культуру. Гэта робіць літаратуру багатай і разнастайнай, а інтэрпрэтацыі антычных сюжэтаў – цікавымі і актуальнымі для сучасных чытачоў.